# «...СТАЦЬ МАТОРАМ АБНАЎЛЕННЯ

## Другое. Рэалізацыя прадукцыі

«Вырабіць — добра. Гэта мы ўмеем. Якасна, няякасна, дорага, танна — вырабілі. Але галоўнае пытанне — рэалізаваць прадукцыю і атрымаць грошы. У апошнія гады знешні гандаль арганізацый Мінпрама характарызаваўся, з аднаго боку, ростам экспартных паставак, з другога — вымушаным сыходам з заходніх рынкаў», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. У 2023 годзе галіна выдала рэкордны за апошняе дзесяцігоддзе экспарт — 6,5 мільярда долараў. Прырост да ўзроўню 2022 года — амаль паўмільярда (8 працэнтаў). «Прычым экспарт стабільна павялічваецца тры гады запар. Значыць, прамысловасць змагла нівеліраваць негатыўныя тэндэнцыі 2019—2020 гадоў. Дарэчы, трэба нам разгледзець структуру гэтага так званага экспарту. Пастаўкі пераарыентаваны на рынкі дружалюбных краін. У першую чаргу на традыцыйны рынак нашай Расіі і іншых дзяржаў СНД», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Але, па яго словах, на далёкім замежжы сітуацыя нашмат горшая. Аб'ём продажаў склаў менш чым 20 працэнтаў у адносінах да дасанкцыйнага 2021 года. Не выкананы планы па экспарце ў дружалюбныя краіны Далёкай дугі. «У Афрыцы, Лацінскай Амерыцы, Азіі сёння вялізны попыт на прамысловую прадукцыю. Тут трэба шчыльна працаваць і займаць свае нішы. І перш за ўсё — на Афрыканскім кантыненце. Харчовая бяспека — адно з самых жыццёва важных для Афрыкі пытанняў. Таму там асабліва запатрабаваны сельскагаспадарчая тэхніка і абсталяванне. Я ведаю гэтыя цяжкасці, складанасці. Але пры складанасцях там трэба працаваць. І той, хто хоча працаваць, той там працуе», — заўважыў беларускі лідар. Ён звярнуў увагу, што сёння ёсць дамоўленасці аб пастаўках звыш трох тысяч трактароў, 80 камбайнаў і 30 самазвалаў у Зімбабвэ. Больш за 150 трактароў — у Тагалезскую Рэспубліку. У 2024 годзе плануюцца пастаўкі тэхнікі ў Нікарагуа, В'етнам, Іран, Пакістан.

«А чаму пасля ўсіх праведзеных перагавораў на вышэйшым узроўні мы не працуем з Экватарыяльнай Гвінеяй? — спытаў Прэзідэнт. — Відавочна, трэба ісці далей, пашыраць супрацоўніцтва. І разумець, што наша стратэгічная задача — стварэнне зборачных вытворчасцяў беларускай тэхнікі ў апорных краінах. Ключавая мэта сёння — дыверсіфікацыя экспарту. Усё, што патрабуецца ад мяне для гэтага, прымаецца неадкладна. Створаны неабходныя ўмовы, і вам трэба як мага больш актыўна выкарыстоўваць меры фінансавай падтрымкі беларускага экспарту».

Па словах Прэзідэнта, нягледзячы на тое што больш за 90 працэнтаў прадукцыі ідзе на рынак Расіі, мы страчваем там пазіцыі па традыцыйных беларускіх таварах, якія заўсёды карысталіся попытам за сваё якасць і надзейнасць. «Мне дакладваюць, што сёння айчынная прадукцыя саступае аналагам як па кошце, так і па якасці. Па кошце яшчэ вытлумачальна. Але чаму па якасці?» — спытаў кіраўнік дзяржавы. Экспарт беларускіх трактароў у 2023 годзе скараціўся на 18 працэнтаў. Доля беларускіх трактароў у расійскім імпарце знізілася да мінімальных за апошняе дзесяцігоддзе 10,6 працэнта, грузавых аўтамабіляў — да 6 працэнтаў.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на яшчэ адзін вядомы брэнд «Атлант», у рабоце якога назіраюцца тыя ж пагрозлівыя тэндэнцыі. Аб'ёмы экспарту халадзільнікаў і маразільнікаў, яшчэ ўчора запатрабаваных, скараціліся амаль у два разы. «Што перашкаджае прадаваць прадукцыю? Кітай, Індыя і іншае... Дык вы прывыкайце да канкурэнцыі. Канкурэнцыя будзе толькі ўзмацняцца. Дайшлі да таго, што сістэматычна ўзнікаюць прастоі, а людзей адпраўляюць у вымушаныя водпускі, — абурыўся Аляксандр Лукашэнка. — Чаму мы губляем рынак? Усе чулі, у штогадовым Пасланні Прэзідэнт Расіі анансаваў, што да 2030 года суб'екты Федэрацыі павінны атрымаць каля 40 тысяч аўтобусаў, тралейбусаў, трамваяў, электробусаў. Грошы на гэта прадугледжаны. Задача беларускай прамысловасці — падключыцца і забяспечыць не менш як 30 працэнтаў патрэбных аб'ёмаў. Гэта наша ніша. Трэба толькі закасаць рукавы і працаваць. Тыя часы, калі за плыт выкінуў трактар і аўтамабіль, і прыйшлі людзі, якія ў чарзе стаялі і купілі ваш трактар, даўным-даўно скончыліся». Прэзідэнт падкрэсліў, што Міністэрства замежных спраў павінна тут быць у першых радах. Па яго словах, у рэалізацыі прадукцыі на экспарт роля знешнепалітычнага ведамства вызначальная.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на яшчэ адну негатыўную тэндэнцыю — унутраны рынак аддаём канкурэнтам. «Нягледзячы на наяўнасць шырокай лінейкі айчыннай тэхнікі, да гэтага часу закупляем імпартныя аналагі. І гэта не адзінкавыя выпадкі. Летась толькі трактароў набылі больш за 1000. Амаль на 40 мільёнаў долараў. Праводзім мадэрнізацыю падшыпнікавага завода. Якасць прадукцыі сёння супастаўная з прадукцыяй сусветных лідараў. Аднак высокія выдаткі на вытворчасць не дазваляюць канкурыраваць па кошце ў тэндарных закупках нават на канвеерах беларускіх машынабудаўнічых прадпрыемстваў. Толькі ці справа ў тэндарах? — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Забываем простую ісціну: скупы плаціць двойчы. Можна сэканоміць капейкі на кошце падшыпніка і страціць тысячы ад прастою тэхнікі з-за яго замены». Прэзідэнт спытаў пра меры, якія прымаюцца па абароне ўнутранага рынку. Што канкрэтна зроблена і робіцца?

«Пакуль, як следства ўсіх пазначаных негатыўных тэндэнцый, — праблемы з рэалізацыяй. Склады трашчаць ад гатовай прадукцыі. Складскія запасы за 2023 год выраслі амаль на чвэрць (на 350 мільёна рублёў, ці на 23 працэнты). Віцэ-прэм'ер профільны мяне супакойвае: «Гэта нармальна, так заўсёды было, і ўчора, і пазаўчора. Мы тут зараз усё прададзім». Але мы ж перыяд да перыяду ацэньваем гэтыя запасы. А колькі тэхнікі знаходзіцца на пляцоўках у дылераў, якія шмат для каго сталі дадатковым складам за мяжой? За гэтую шырму ў чарговы раз ні ў кога схавацца не атрымаецца», — акрэсліў праблему Аляксандр Лукашэнка.

І зноў гаворка зайшла пра Мінскі трактарны завод. Як заўважыў Прэзідэнт, на складах яго гандлёвых дамоў амаль 6,5 тысячы адзінак тэхнікі, гэта больш за двухмесячны аб'ём вытворчасці. «Восьдзе вашы аб'ёмы і экспарт. Пры гэтым, як дакладвае Камітэт дзяржаўнага кантролю, значная колькасць суб'ектаў таваразаправодных сетак увогуле не бярэ ўдзелу ў рэалізацыі прадукцыі (навошта вы іх стварылі тады?), а яе кошт пры продажах праз гандлёва-праводзячыя сеткі значна ўзрастае. Каго кормім там?» — спытаў беларускі лідар. Ён прывёў яшчэ адзін прыклад. Пры рэалізацыі ў Расійскую Федэрацыю па схеме «вытворца — генеральны імпарцёр — дыстрыб'ютар — дылер — канчатковы спажывец» кошт франтальных пагрузчыкаў «АМКАДОР» павялічваецца ў цане больш як на 50 працэнтаў, грузавой і пасажырскай тэхнікі МАЗ — на 20 працэнтаў. «Ну і як тут канкурыраваць?» — задаў рытарычнае пытанне Прэзідэнт. Ён таксама звярнуў увагу, што не забяспечана выкананне патрабавання па скарачэнні знешняй пратэрмінаванай дэбіторскай запазычанасці. За мінулы год яна вырасла больш чым на 10 працэнтаў. «Узнікае простае пытанне: навошта мы крэдытуем пакупніка? З'яўленне запазычанасці часта з'яўляецца вынікам бяздумнай гонкі за выкананнем паказчыкаў па разгрузцы складоў і экспарту», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржвы.

Аляксандр Лукашэнка падвёў агульны вынік. Гэта — найперш падзенне якасных паказчыкаў развіцця прадпрыемстваў. Рэнтабельнасць не дацягвае да ўзроўню 2022 года. Расцуць колькасць стратных арганізацый і сумы іх страт.

«Так, мы маем складаную лагістыку і рост кошту імпартнай сыравіны. Разбурэнне каапераціўных сувязяў з заходнімі пастаўшчыкамі прывяло да неабходнасці пошуку альтэрнатыўных партнёраў або наладжвання ўласнай вытворчасці камплектавальных. У тым ліку паскоранай распрацоўкі і ўкаранення новых тэхнічных рашэнняў. Што рабіць, увогуле зразумела. Чаму тармозім? Чаму не робім?» — звярнуў увагу Прэзідэнт.

## Трэцяе. Імпартазамяшчэнне

«Мы можам ствараць канкурэнтаздольную тэхніку з выкарыстаннем айчынных матэрыялаў і камплектавальных. Тут даказваць нічога не трэба. Мы можам, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Аднак па шэрагу кірункаў абнаўленне прадукцыі і вытворчасцяў ідзе вельмі марудна. Кожная крытычная пазіцыя паказвае нашы слабыя месцы. Менавіта па іх канкурэнты потым б'юць санкцыямі». Прэзідэнт падкрэсліў, што неабходна прыняць меры па забеспячэнні максімальнай тэхналагічнай незалежнасці і стварэнні ўмоў для ўстойлівай работы эканомікі, якая не залежыць ні ад якіх санкцый. Аляксандр Лукашэнка назваў гэта стратэгічнай задачай для нашага прамысловага комплексу.

«Шлях адвёрткавай зборкі магчымы толькі ў пачатку новай вытворчасці. Трэба выбудаваць надзейную абарону ад любых вонкавых фактараў. Гэта яшчэ адна задача для ўсіх. Вось чаму так жыццёва важна імпартазамяшчэнне, якім трэба займацца ўвесь час. Сёння гэта прыярытэт прыярытэтаў. Мы шмат пра гэта гаворым, але разгортваемся вельмі павольна. Доля імпартнага складніка ў беларускай прадукцыі па-ранейшаму высокая», — заўважыў Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу, што для інвестараў ставяцца ўмовы па дасягненні вызначанага ўзроўню лакалізацыі. Яны іх прымаюць і выконваюць. А па беларускіх традыцыйных вытворчасцях доля імпартнага складніка ў сыравіне і матэрыялах застаецца на высокім узроўні, паказчыкі з году ў год практычна не зніжаюцца.

«Да вас патрабаванне па ўсіх кірунках распрацаваць стратэгіі па павышэнні ўзроўню лакалізацыі. Давядзіце да кожнага напружаныя заданні і забяспечце іх рэалізацыю, — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы. — Упэўнены, усе прысутныя таксама добра разумеюць, якія рызыкі нясе залежнасць ад замежнага абсталявання і праграмнага забеспячэння. Таму стварэнне айчыннага софту і яго ўкараненне павінны стаць безумоўнай першачарговай задачай для нашых распрацоўшчыкаў. Пакуль па гэтым кірунку ўвогуле нічога не робіцца. Як карысталіся заходнім праграмным забеспячэннем, так і працягваем».

Па словах беларускага лідара, асноўная маса сённяшніх праектаў — гэта мадэрнізацыя прамысловых гігантаў, якія мы захавалі з часоў Савецкага Саюза (МАЗ, Трактарны завод, БЕЛАЗ). «Гэта добра, але нам неабходна ствараць абсалютна новыя, перадавыя вытворчасці, якія выпускаюць інавацыйныя прадукты. І таму яшчэ адной задачай для вырашэння існых праблем бачыцца ўзмацненне інтэграцыі прамысловасці з навукай. Развіццё высокатэхналагічных галін, вытворчасць вылічальнай, электроннай і аптычнай апаратуры. Ужо цяпер мы павінны рыхтаваць навукова-даследчую базу і інжынерна-тэхнічны персанал для распрацоўкі перспектыўных тэхналогій і фарміравання навукова-тэхнічнага задзелу ў мэтах далейшага развіцця мікраэлектроннай прамысловасці», — заявіў ён.

Па словах Прэзідэнта, у гэтых умовах асаблівую важнасць набывае рэалізацыя праграм Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, сумесных імпартазамяшчальных праектаў, якія ствараюць аснову тэхналагічнага суверэнітэту і эканамічнай бяспекі. «Сродкі выдзелены. Іх неабходна не толькі своечасова асвоіць, але і стварыць прадукт, які будзе карыстацца доўгатэрміновым попытам», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Аднак, па яго словах, якаснай мадэрнізацыі галіны профільнае міністэрства і прадпрыемствы не былі гатовы. Да нядаўняга часу не было ні праектаў, ні ідэй. «Я сумняваюся, што яны ёсць і цяпер. Работа пайшла, хоць тэмпы відавочна патрабуюць паскарэння», — заўважыў беларускі лідар. Камітэтам дзяржаўнага кантролю ўстаноўлены шэраг праблемных пытанняў. Не забяспечаны эфектыўнасць і выхад на праектныя магутнасці асобных мадэрнізаваных вытворчасцяў, у выніку чаго выклікае сумненне іх акупнасць ва ўстаноўленыя тэрміны, заўважыў Прэзідэнт. Загрузка высокатэхналагічнага абсталявання, уведзенага ў 2023 годзе Аршанскім інструментальным заводам, па вытворчасці імпартазамяшчальнага сучаснага металарэзнага інструмента (свёрлаў і фрэз) складае толькі 50 працэнтаў.

«Зноў тармажэнне. Няўжо незразумела: будзем тармазіць і плесціся ў хвасце — нас затопчуць. Вам далі ўсе неабходныя інструменты па фінансаванні праектаў, далі паўнамоцтвы для прыняцця аператыўных рашэнняў. Што яшчэ патрэбна? — спытаў Прэзідэнт. — Наша стратэгічная задача — дасягнуць тэхналагічнага суверэнітэту ў скразных сферах, якія забяспечваюць устойлівасць усёй эканомікі краіны. Гэта сродкі вытворчасці, станкі, робататэхніка. Праекты па дасягненні тэхналагічнага суверэнітэту павінны стаць маторам абнаўлення нашай прамысловасці, дапамагчы ўсёй эканоміцы выйсці на перадавы ўзровень эфектыўнасці і канкурэнтаздольнасці». Таму, па словах кіраўніка дзяржавы, задача ўрада — ужо цяпер прапрацаваць і сфарміраваць доўгатэрміновы, як мінімум да канца бягучага дзесяцігоддзя, заказ ад расійскіх партнёраў на высокатэхналагічную прадукцыю, каб нашы прадпрыемствы разумелі, па якіх правілах ім працаваць у Расіі.

## Чацвёртае. Дысцыпліна

«Мы зноў вяртаемся да пытанняў выканальніцкай дысцыпліны, дакладней да яе адсутнасці і слабага кантролю на ўсіх узроўнях. Як вынік, увесь час выкрываюцца карупцыйныя схемы, і, што абсалютна непрымальна, колькасць іх расце. Ну, гэта вашы праблемы. Хочаце сядзець у турме і не працаваць — калі ласка», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле інфармацыі Генеральнай пракуратуры, па выніках мінулага года колькасць такіх злачынстваў выраслa амаль на чвэрць. Выкрыта карупцыйная схема падкупу службовых асоб прадпрыемстваў прамысловасці за арганізацыю закупак абсталявання ў пэўных камерцыйных арганізацыях. Узбуджаны крымінальныя справы ў дачыненні да службовых асоб нашага флагмана — ААТ «БЕЛАЗ». Устаноўлены факт, калі прадугледжаная заканадаўствам магчымасць рэалізацыі прадукцыі па цэнах ніжэйшых за сабекошт (пад маркай разгрузкі складоў) выкарыстоўвалася для асабістага ўзбагачэння службовых асоб. Тавар па нізкіх цэнах адгружаўся падкантрольнаму пасрэдніку, пасля чаго перапрадаваўся па больш высокім кошце. Рэгулярна выяўляюцца факты крадзяжу гатовай прадукцыі і камплектавальных да яе. Камітэт дзяржаўнага кантролю паведамляе, што бардак і ў металургічнай галіне. «Белдругасмет» не забяспечвае металургічныя і машынабудаўнічыя прадпрыемствы ломам чорных і каляровых металаў у неабходных аб'ёмах. «Ваша безгаспадарчасць і дыспарытэт закупачных цэн на металалом стварылі перадумовы для ўзнікнення ценявога абароту на рынку металасыравіны. Я даручыў Генеральнаму пракурору надаць самую пільную ўвагу гэтым пытанням. І не трэба тут спасылацца не нейкія рызыкі. На гэта ўжо вочы закрываем. Але калі вы ўжо ў кішэню кладзеце, і гэта на вачах у тых, хто павінен глядзець і глядзець, вы не хадзіце і не плачце, што тут празмерна некага напружваюць. За памылку ніхто ніколі не пакарае. Вы заўсёды можаце дастукацца нават да Прэзідэнта і растлумачыць сваю памылку. Але калі вы крадзеце бессаромна, апускаючы працоўныя калектывы тысячныя і флагманы нашай прамысловасці, — даравання тут не будзе. Я буду Прэзідэнтам ці хтосьці іншы, калі вы хочаце захаваць краіну, будзе тое ж самае, адказнасць будзе самая жорсткая», — папярэдзіў Прэзідэнт.

## Пятае. Якасць прадукцыі

Ключавым пытаннем Аляксандр Лукашэнка назваў забеспячэнне якасці выраблянай прадукцыі і належнага сэрвіснага абслугоўвання. «Калі па галоўных пазіцыях прасядаем, то аб якой рэалізацыі можна казаць? Факты, аб якіх дакладвае Камітэт дзяржаўнага кантролю, недапушчальныя. Асабліва выпадкі, калі новая тэхніка выхо-

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*